

РАСКАЗВАЕМ АБ АРДЭНАНОСЦАХ

Важак і выхавацель

Мне даводзілася неаднаразова бываць у канцылярыі саўгаса імя Раманава. Аднак застаць дырэктара Мікалая Давыдавіча Ляонава ў рабочым кабінеце не ўдавалася.

— Паехаў у брыгады, на фермы, — атрымаеш адказ. — Прыязджайце раніцай, гадзін у шэсць — сем. Заўсёды знойдзеце.

Парада дапамагла. У сем гадзін раніцы дырэктар знаходзіўся ў кабінеце і раіўся са спецыялістамі і брыгадзірамі як лепш і хутчэй завяршыць сяўбу яравых. Праз некалькі мінут кабінет апусцеў. Усе накіраваліся ў брыгады, туды, дзе ідзе барацьба за ўраджай.

Ужо толькі па гэтаму аднаму штрыху можна меркаваць аб рабоце дырэктара. Ён заўсёды з людзьмі, там, дзе вырашаюцца найбольш адказныя і неадкладныя задачы. А такіх у гаспадарцы ў любы час нямала. Толькі паспявай. Вось чаму Мікалай Давыдавіч і не заседжваецца ў кабінеце. Яго чакаюць усюды: на палях і фермах, на будаўнічай пляцоўцы і ў майстэрні па рамонту тэхнікі, на іншых участках вытворчасці.

Здольнасць арганізаваць людзей, пераканаць, павесці за сабой прыносіць поспех у працы. Летась саўгас сабраў па 18,5 цэнтнера зерня і па 185 цэнтнераў бульбы з гектара. За мінулую пяцігодку валавы збор зерня павялічыўся ў два разы, бульбы — у 2,6 раза. На сто гектараў сельгасугоддзяў атрымана па 211 цэнтнераў мяса. Надоена ад каровы па 2.572 кілаграмы малака. Пяцігадовы план продажу дзяржаве зерня, бульбы, малака і мяса саўгас выканаў паспяхова.

Высокая працоўная і палітычная актыўнасць рабочых саўгаса сёлета. Яны з'яўляюцца ініцыятарамі сацыялістычнага спаборніцтва за павелічэнне вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі, за высокі ўраджай усіх сельскагаспадарчых культур. Сяўба яравых праведзена высакаякасна і ў лепшыя тэрміны. Арганізаван старанны догляд пасеваў. Віды на ўраджай добрыя. Разгорнута нарыхтоўка кармоў. Асаблівая ўвага звернута на закладку сенажу.

Паважаюць рабочыя свайго кіраўніка. Ён не толькі здольны арганізатар, але чулы і спагадлівы чалавек. Да яго ідуць за парадай па розных пытаннях. Мікалай Давыдавіч кожнага ўважліва выслухае, параіць, як лепш паступіць, а калі патрэбна і акажа дапамогу.

Акрамя непасрэдных службовых абавязкаў, камуніст Ляонаў з'яўляецца вопытным выхавацелем калектыву. Ён — палітінфарматар. Праводзіць палітінфармацыі рэгулярна. Яны змястоўныя, даходлівыя да людзей, мабілізуючыя на новыя поспехі.

Актыўна ўдзельнічае Мікалай Давыдавіч у грамадскай рабоце. Як член райкома КПБ і парткома саўгаса праводзіць вялікую работу: выступае з лекцыямі перад рабочымі і служачымі саўгаса, робіць даклады на ўрачыстых пасяджэннях выканкома пасялковага Савета, прысвечаных рэвалюцыйным святам.

Вопыт кіраўніка і выхавацеля тав. Ляонаў набыў дзякуючы свайму вялікаму і складанаму шляху, сістэматычнай і ўпартай вучобай. Маладым хлопцам, калі на краіну напалі нямецка-фашысцкія захопнікі, ён пайшоў у партызаны, камандаваў узводам народных мсціўцаў. Заслугі партызанскага камандзіра высока ацэнены. Мікалай Давыдавіч узнагароджан ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалем «Партызану Айчыннай вайны I ступені».

Пасля вайны камуніст Ляонаў працаваў на адказных партыйных і савецкіх пасадах. Усюды паказваў узоры ў працы і паводзінах. Вучыўся сам і вучыў людзей. Гэта прынесла павагу і прызнанне.

З 1964 года тав. Ляонаў кіруе саўгасам. Гаспадарка ўпэўнена і паспяхова развівае ўсе галіны вытворчасці. Планы па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі саўгас перавыконвае. За поспехі, дасягнутыя ў мінулай пяцігодцы, Мікалай Давыдавіч Ляонаў узнагароджан ордэнам Леніна.

І. КОНАШ.